Цэнтральны Камітэт Усесаюзнага Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі заклікае ўсіх камсамольцаў, усіх юнакоў і дзяўчат горача адгукнуцца на Зварот ЦК КПСС да ўсіх выбаршчыкаў, дастойна сустрэць выбары ў Вярхоўны Савет СССР. ЦК ВЛКСМ заклікае маладых выбаршчыкаў прыняць дзейны ўдзел у выбарах і аддаць свае галасы за кандыдатаў народнага блоку камуністаў і беспартыйных.

(Са зварота ЦК ВЛКСМ да ўсіх маладых выбаршчыкаў)

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 7 (477) | Серада, 28 лютага 1962 г. | Цана 1 кап.



*НА ЗДЫМКУ: Агітатары Алена 'рукшына і Анатоль Чачотка яшчэ 'аз правяраюць спісы выбаршчыкаў.*

Цікавыя мерапрыемствы для выбаршчыкаў арганізуе агітпункт 17-га выбарчага ўчастка Ленінскага раёна. Кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР тут зарэгістраваны Першы сакратар ЦК КПБ тав. К. Т. Мазураў і першы сакратар Мінскага гаркома партыі тав. А. Б. Насілоўскі.

Загадчык агітпункта В. М. Цімафеева, загадчык агіткалектыва А. С. Фарфель і агітатары паклапаціліся аб тым, каб тут было ўтульна і прыгожа, каб былі створаны ўсе ўмовы для культурнага адпачынку выбаршчыкаў.

Агітпункт маляўніча аформлены нагляднай агітацыяй. Тут заўсёды мнагалюдна. Вечарамі і ў нядзельныя дні сюды прыходзяць выбаршчыкі не толькі пачытаць газету ці часопіс, а паслухаць цікавую лекцыю, напрыклад, пра Балгарыю, пра палёты ў космас, атрымаць кансультацыю па пытаннях савецкага права, падзяліцца ўражаннямі аб Звароце ЦК КПСС да ўсіх выбаршчыкаў. А нядаўна агітпункт набыў тэлевізар. Гэта дае магчымасць яшчэ больш ажывіць работу агітпункта.

У гэтыя дні частыя і жаданыя госці ў дамах выбаршчыкаў агітатары Багамолаў (студэнт юрфака), старшы групы агітатараў аспірант філалагічнага факультэта Пятакоў. Яны знаёмяць выбаршчыкаў з савецкай выбарчай сістэмай—самай дэмакратычнай ў свеце.

Праведзены цікавыя вечары адпачынку з удзелам ансамбля песні і танца Беларускай ваеннай акругі, артыстаў філармоніі і выхаванцаў музычных школ горада. Дацэнт Маханёк на вечары выбаршчыкаў прачытаў лекцыю аб Праграме партыі.

Цяпер, калі выбаршчыкі апавешчаны аб дні і месцы галасавання і растлумачана палажэнне аб выбарах, агітатары прыступаюць да сваёй непасрэднай работы—агітацыі за кандыдатаў.

У добры час, сябры!

**В. КУПРЭЕНКА,**
нам. загадчыка агітпункта.

# ВУЧЭБНУЮ РАБОТУ—У ЦЭНТР УВАГІ

(З партсходу фізфака)

Партыйная арганізацыя фізічнага факультэта на сходзе, які адбыўся нядаўна, абмеркавала адно з важнейшых пытанняў у рабоце факультэта — аб выніках зімовай экзаменацыйнай сесіі і задачах партарганізацыі на другі семестр.

Дэкан факультэта тав. *Л. В. Валадзько* адзначыў у дакладзе, што хоць паспяховасць на факультэце ў сярэднім павысілася, аднак вынікі экзаменаў на 1 і 2 курсах выклікаюць законную трывогу. 99 студэнтаў гэтых курсаў атрымалі нездавальняючыя адзнакі і каля 50 не з'явіліся без уважлівых прычын на экзамены. Некаторыя студэнты не здалі нават па 2—3 экзамены. Падрабязна спыніўшыся на выніках работы 1 курса, дзе 56 непаспяваючых, дакладчык ускрыў прычыны нізкай паспяховасці курса. Тут няма належнай сістэматычнай работы некаторых студэнтаў на працягу ўсяго семестра. Камсамольская арганізацыя курса, выкладчыкі, якія замацаваны за вучэбнымі групамі, слаба кантралявалі работу студэнтаў, не аказвалі практычнай дапамогі. Камітэт камсамола факультэта абмяжоўваўся агульнымі ўказаннямі ў кіраўніцтве работай камсамольскай арганізацыі курса. Выхаваўчая работа сярод студэнтаў вялася ў адрыве ад вучэбнай работы. Многія выкладчыкі да цяперашняга часу не пацікавіліся нават вынікамі сесіі на курсе. Вельмі нізкая вучэбная дысцыпліна, студэнты прапускаюць многа лекцый.

Па ініцыятыве дэканата і лектараў на працягу семестра штотыднёва праводзіліся кансультацыі па фізіцы і матэматыцы, аднак з двухсот студэнтаў на іх з'яўлялася не больш, чым 10—15 чалавек, што гаворыць аб несістэматычным вывучэнні матэрыялу. У перыяд жа сесіі яўка была поўнай, і пытанняў задавалася шмат. На жаль, гэта адбывалася толькі перад самымі экзаменамі.

На першы курс некаторыя студэнты папалі выпадкова, па недагляду прыёмнай камісіі. Гэта Карсакоў, Сцешык, Доўнар, Стальмашок і іншыя, якія не здалі ніводнага з трох экзаменаў.

Хоць студэнты 3 і 5 курсаў не маюць нездавальняючых адзнак, узровень іх ведаў пакідае жадаць лепшага. Вучэбная і працоўная дысцыпліна таксама нізкая.

Перагрузка вучэбнымі заняткамі многіх выкладчыкаў, вялікая колькасць так званых пачасавікоў у значнай ступені пагаршала арганізацыю метадычнай работы кафедр, зніжала ўзровень навукова-даследчай работы студэнтаў.

Першым у спрэчках па дакладу выступіў рэктар універсітэта прафесар *А. Н. Сеўчанка.* Ён падрабязна спыніўся на задачах факультэта ў паляпшэнні якасці навуковай, вучэбнай і палітыка-выхаваўчай работы. Перад партыйнай арганізацыяй і дэканатам фізфака, зазначана далей у выступленні, стаіць канкрэтная мэта: ліквідаваць акадэмічную запазычанасць студэнтаў. А. Н. Сеўчанка прапанаваў правесці агульны сход факультэта з абмеркаваннем вынікаў Усесаюзнай нарады работнікаў кафедр грамадскіх навук.

Выступленні прафесараў *І. Р. Некрашэвіча, А. Х. Турэцкага,* дацэнтаў *М. П. Халімановіча і І. І. Пятроўскага* ў асноўным былі прысвечаны пытанню барацьбы з лібералізмам у ацэнцы ведаў студэнтаў, вопыту іх работы на малодшых курсах.

Сакратар факультэцкага камітэта камсамола тав. *П. Салаў* указаў на неабходнасць правядзення партыйным бюро факультэта нарад камсамольскага актыву, дзе трэба ставіць і абмяркоўваць важнейшыя пытанні работы факультэта.

З крытыкай вынікаў здачы экзаменаў студэнтамі-камуністамі малодшых курсаў, якія амаль усе атрымалі здавальняючыя адзнакі, выступіў сакратар партбюро тав. *Г. В. Авечкін.*

Загадчык майстэрні факультэта камуніст *Ламавой* і асістэнт *А. З. Нікалаеня* звярнулі ўвагу сходу на неабходнасць паляпшэння арганізацыі работы і забеспячэння майстэрні матэрыяламі.

Партыйны сход прыняў пастанову, якая накіроўвае ўвесь калектыў факультэта на ліквідаванне недахопаў і паляпшэнне работы ў другім семестры.

**С. КІСЛЯКОЎ.**

## Лекцыі для працоўных

*Прафесарска-выкладчыцкі калектыў нашага універсітэта прымае актыўны ўдзел у прапагандзе навуковых і грамадска-палітычных ведаў сярод працоўных сталіцы і рэспублікі.*

*Асабліва многа лекцый чытаецца нашымі вучонымі цяпер, калі рабочыя, сяляне і інтэлігенцыя праяўляюць вялікую цікавасць да гістарычных рашэнняў XXII з'езда КПСС і тых навуковых і практычных праблем, якія належыць ажыццявіць, каб камунізм стаў рэчаіснасцю. Толькі за апошнія два тыдні па пуцёўках ЦК і абкома КПБ у розныя раёны рэспублікі выязджалі 40 лектараў, работнікаў універсітэта. Так, дацэнт Ц. І. Базылеў прачытаў некалькі лекцый на тэму «Шляхі пераходу ад сацыялістычных да камуністычных вытворчых адносін» для працоўных Дзяржынскага раёна, дацэнт І. М. Канюшка выступіў з цікавай лекцыяй «Значэнне хіміі для стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма», дацэнт С. М. Зубаў чытаў лекцыі ў Смалявіцкім раёне аб савецкіх даследаваннях у Антарктыдзе.*

*Добрыя водгукі аб прачытаных лекцыях на разнастайную тэматыку у Лагойскім, Смалявіцкім, Плешчаніцкім, Пухавіцкім і іншых раёнах рэспублікі маюць дацэнт У. В. Цакуноў, прафесар І. Р. Некрашэвіч, дацэнты К. І. Брыш, Н. П. Хрыпко і іншыя.*

**Ул. КУЛАЖАНКА.**

Сярод натоўпу пасажыраў, сабраўшыхся да цягніка «Мінск—Стаўбцы», некалькі чалавек з чамаданамі і пакункамі выглядалі выключэннем: у асноўнай масы адзіным багажом былі лыжы. Гэта студэнты накіроўваліся да месца старта агульнаўніверсітэцкіх спаборніцтваў па праграме круглагадавой спартакіяды

# УНІВЕРСІТЭТ ВЫЙШАЎ НА ЛЫЖНЮ



Лена Напорка перад стартам.

У дарозе выяўляюцца непрыемнасці: некаторыя ўдзельнікі, на якіх ускладваліся вялікія надзеі, не з'явіліся наогул.

Вось і Зялёнае. Далей цягнік ідзе амаль пустым... Уласна кажучы, зялёнага тут мала—толькі прыдарожны ельнік ды хвойнік. Але ж і не шэра.

Да пачатку старта яшчэ шмат часу. Яго хапае, каб нацерці лыжы, прышыць нумары і спусціцца некалькі разоў з паросшай маладым хвойнікам гары.



Валя Конаш абыходзіць суперніцу.

11 гадзін. Аб'яўляецца пачатак спаборніцтваў... Па колькасці выпітай глюкозы цяжка было прадбачыць вострую барацьбу на дыстанцыі. Аднак гэтыя ўяўленні не пацвердзіліся. Першымі стартуюць мужчыны эстафеце 4×5 кіламетраў. Пераможцамі выходзяць студэнты геафака. На другім месцы—філфак.

Добра прайшлі 10-кіламетровую дыстанцыю дзяўчаты філалагічнага факультэта Валя Конаш і Лена Напорка. Яны правялі гонку ў высокім тэмпе.

На дыстанцыі 15 кіламетраў нядрэнна выступіў студэнт 2 курса аддзялення журналістыкі В. Дашкевіч. Яго вынік—58 мінут 40 секунд, толькі на 50 секунд больш, чым у студэнта геафака П. Явіда, які фінішыраваў першым.

Трэба адзначыць, што ўражанне ад вынікаў спаборніцтваў не захапляючае. Ніхто з мужчын на сваёй дыстанцыі не здолеў паказаць вынік першага разраду. З 36 чалавек толькі 10 выканалі нарматывы другога разраду і столькі ж—трэцяга.

У жанчын на 10-кіламетровай дыстанцыі толькі 3 першаразрадных вынікі: у Дубінінай (юрфак), Кудловіч (фізфак-2), Міронавай (хімфак).

У агульным ліку на першае месца выйшаў геаграфічны факультэт (13 ачкоў). Другое і трэцяе месцы падзялілі хімфак і другая каманда фізфака (па 16 ачкоў), на чацвёртым месцы філолагі (17 ачкоў). На апошнім—студэнты біялагічнага факультэта.

Тэкст **В. ЖУРАЎЛЕВА,**
Фота **І. КРУМІНА і М. ЯКІМЧЫКА.**



Вячаслаў Пушкін (1 курс аддз. журналістыкі) толькі што фінішыраваў.

# ДРУГІ ЭШАЛОН НАВУКІ

НАША навука стаіць перад велізарнымі задачамі, пастаўленнымі XXII з'ездам партыі. Вялікае значэнне мае падрыхтоўка будучых навуковых кадраў. Будучы вучоны павінен фарміравацца ўжо ў студэнцкія гады. У гэтай сувязі новыя задачы паўстаюць і перад навуковым студэнцкім таварыствам.

За прайшоўшы год СНТ універсітэта правяло вядомую работу, вызначыліся некаторыя зрухі. XVIII навуковая студэнцкая канферэнцыя была праведзена, па агульнай думцы, на высокім узроўні. Добрае ўражанне на нашых гасцей—студэнтаў з ВНУ Масквы, Ленінграда, Кіева, Рыгі, Вільнюса і іншых гарадоў зрабілі даклады, прачытаныя нашымі студэнтамі на пасяджэннях секцый, і мерапрыемствы, якія былі прадугледжаны саветам СНТ універсітэта для іх.

Больш паспяхова, чым у мінулыя гады, удзельнічаў універсітэт у рэспубліканскім аглядзе студэнцкіх навуковых работ. Узрасла колькасць гурткоў — цяпер іх 54 (у мінулым навучальным годзе было 42), значна ажывілася іх работа. Яны пачалі змагацца за распрацоўку больш сур'ёзных і актуальных пытанняў. Усё гэта добра. Аднак поспехі гурткоў невялікія.

Аб нашых магчымасцях сведчаць работы, якія на ўсесаюзным аглядзе былі ўдастоены залатых медалёў. Работы Галенчанкі (гістарычны факультэт) і Адзярыха (фізфак), выкананныя на высокім навуковым узроўні, робяць умоўным паняцце «навуковая студэнцкая работа». Такіх работ у нас вельмі мала, на жаль.

З другога боку, навуковую студэнцкую работу неабходна разглядаць як добрую школу, дзе складваюцца навыкі самастойнага навуковага даследавання, дзе фарміруюцца інтарэсы будучага вучонага.

Не на ўсіх факультэтах навуковая студэнцкая работа займае адпаведнае месца. Нас не можа задаволіць становішча на хімічным факультэце, які з вялікімі цяжкасцямі змог прадставіць на агляд толькі 7 работ. На факультэце да гэтага часу не было савета СНТ. Пытанні работы СНТ выпалі з поля зроку партыйнай і камсамольскай арганізацый факультэта.

Па даручэнню цэнтральнага савета намеснік старшыні У. Кардымон дамовіўся з камсамольскімі арганізацыямі аб рабоце членаў СНТ фізічнага, матэматычнага і хімічнага факультэтаў у грамадскіх канструктарскіх, тэхналагічных і эканамічных бюро. Гэта ідэя з-за дрэннай арганізацыі фактычна не ажыццявілася.

Цэнтральны савет часам губляў перспектыву ў рабоце і не мог займацца сваімі першаступеннымі абавязкамі: каардынацыяй студэнцкай навуковай работы ва універсітэце, абагульненнем вопыту, умацаваннем сувязей з другімі ВНУ.

Хацелася б, каб грамадскія арганізацыі факультэтаў узялі пад свой кантроль навуковую студэнцкую работу і аказвалі ёй штодзённую дапамогу. Аб тым, наколькі гэта вынікова, сведчыць вопыт гістарычнага факультэта, дзе пытанне аб навуковай рабоце студэнтаў слухалася на партсходзе, а перад гэтым было абмеркавана на вучоным савеце, у выніку чаго значна ажывілася работа. Былі створаны новыя гурткі: археалагічны, праблемны па гісторыі СССР і інш. У значнай ступені ажывілася работа і на фізічным факультэце. Пры кожнай кафедры створаны гурткі.

З вялікай удзячнасцю адзываюцца студэнты аб сваіх навуковых кіраўніках прафесарах Г. Г. Вінбергу, І. Р. Некрашэвічу, дацэнтах О. Ф. Якушка, І. З. Фішары, Ю. С. Багданаве, М. В. Фрыдман, Т. І. Прыгыцкай і іншых.

Разам з тым далёка не ўсе нашы выкладчыкі ўдзяляюць гэтаму пытанню належную ўвагу.

Вялікім недахопам у навуковай студэнцкай дзейнасці з'яўляецца тое, што студэнты завочнага і вячэрняга факультэтаў не прымаюць у ёй удзелу. У новым саставе савета СНТ неабходна прадугледзець сектары па гэтых факультэтах.

Недастакова выкарыстоўваецца ў студэнцкіх навуковых працах замежная літаратура. З работ, прадстаўленых на агляд, толькі нямногім больш пяці працэнтаў былі з выкарыстаннем такой літаратуры. А вопыт у гэтым напрамку ўжо ёсць. Вось, напрыклад, прафесар М. П. Палеціка добра валодае замежнымі мовамі і дае тэмы работ толькі з выкарыстаннем замежнай літаратуры. Вопыт неабходна пераняць усім кіраўнікам гурткоў.

Саветы СНТ факультэтаў і універсітэта павінны актыўней удзельнічаць ў размеркаванні студэнтаў на працу. Выдатна праявіўшых сябе ў навуковай студэнцкай рабоце трэба смялей рэкамендаваць у аспірантуру.

Некалькі слоў аб напрамку навуковых даследаванняў студэнтаў. У Праграме КПСС сказана: «Залог плённага развіцця навукі — у неразрыўнай сувязі са стваральнай працай народа, практыкай камуністычнага будаўніцтва».

Ва універсітэце ўжо накоплен пэўны вопыт. Неабходна кафедрам шырэй і смялей прыцягваць студэнтаў да распрацоўкі практычных навуковых праблем. У сувязі з гэтым мэтазгодна пайсці на правядзенне канферэнцый, прысвечаных абагульненню практыкі ва ўсіх яе формах. На нашу думку, мэтазгодна ў цэнтральным савеце СНТ стварыць савет па сувязях з вытворчасцю.

У. ЦІТОК,
старшыня цэнтральнага савета СНТ,
У. КАРДЫМОН,
нам, старшыні цэнтральнага савета СНТ.

## ЛЕПШЫ ГУРТОК НА ЮРФАКУ

На снежаньскім аглядзе студэнцкіх навуковых работ найбольш высокія адзнакі атрымалі работы студэнтаў з гуртка адміністратыўнага і дзяржаўнага права, якім кіруе дацэнт А. А. Галаўко. Арганізаванасць і чоткасць, своечасовасць пасяджэнняў, высокі ўзровень падрыхтаваных работ, правільнае кіраўніцтва — вось рысы, якія характарызуюць работу гэтага гуртка, чаго, на жаль, нельга сказаць аб другіх.

У бягучым навучальным годзе на пасяджэннях гуртка былі заслуханы даклады М. Карпенка — аб рабоце ГАІ, В. Камозы — аб пастаянных камісіях выканкомаў мясцовых Саветаў і іншыя.

Для іх работ характэрна, што ўзнятыя праблемы разглядаюцца ў святле рашэнняў XXII з'езда партыі. На прадстаячай канферэнцыі ад гуртка адміністратыўнага і дзяржаўнага права будуць прадстаўлены 2 даклады аб пераходным перыядзе ад дзяржаўнага кіравання да грамадскага самакіравання. Хочацца праз газету падзякаваць студэнтам — членам гуртка і іх кіраўніку дацэнту А. А. Галаўко за добрую работу і пажадаць ім поспехаў у навуковай рабоце.

В. КАХАНОЎСКІ,
старшыня савета СНТ юрфака.



Студэнтка-выпускніца фізічнага факультэта Любоў Сандрыгайла ў мінулым навучальным годзе вывучала ўплыў натрыя на адносную інтэнсіўнасць пар ліній нікеля-медзі. Фота У. СІТНІКАВА.

## У будучых хімікаў

Праграма КПСС падкрэслівае, што развіццё хімічнай прамысловасці — адна з важнейшых нашых задач. Няма, бадай, другой навукі, якая б давала чалавеку такое шырокае поле для доследаў. Таму навукова-даследчая работа так цікавіць многіх студэнтаў-хімікаў. На факультэце працуюць чатыры гурткі СНТ пры кафедрах неарганічнай, арганічнай, фізічнай і аналітычнай хіміі. У іх займаюцца каля 40 студэнтаў, галоўным чынам, 3—4 курсаў.

У гуртку арганічнай хіміі — 16 чалавек. Адны — эксперыментатары, другія працуюць над рэфератамі. Арганічная хімія — адна са складанейшых навук. Для яе характэрна большая складанасць многіх сінтэзаў. Таму эксперыментальнай рабоце павінна папярэднічаць добрая падрыхтоўка. Толькі дзякуючы гэтаму дабіўся вялікага поспеху студэнт 5 курса А. Бубель, работа якога атрымала першую катэгорыю на рэспубліканскім аглядзе студэнцкіх работ.

Вельмі цікавая для вывучэння праблема іёнаабменных смол, якія знайшлі прымяненне ў многіх галінах навукі, тэхнікі, у харчовай прамысловасці, быце. Над вырашэннем гэтай праблемы працуюць члены гуртка аналітычнай хіміі Канюшка, Лабецкі, Дамадыка, Бурмакіна.

Спецыфіка работы патрабуе ад студэнтаў-хімікаў шмат часу — па 5—6 гадзін запар. Варта было б як мага хутчэй **найбольш актыўным удзельнікам СНТ даць магчымасць свабоднага наведвання лекцый. Такая мера зусім неабходна.**

С. ТКАЧ,
старшыня СНТ хімфака.

## Шукальнікі старажытнасцей

Гурток археалогіі пры кафедры гісторыі БССР — самы малады на гістфаку. Цяжка зараз сказаць, хто першым падаў ідэю: правесці лета ў археалагічнай экспедыцыі. І вось студэнты-першакурснікі О. Юроўская, В. Насцюшонак, І. Шорац і інш. бяруцца за работу. Не трэба быць рамантыкам, каб адчуць усю непаўторнасць, усю веліч моманта, калі ты сам, сваімі рукамі бярэш рэч, якая шмат вякоў ляжала пад тоўшчай зямлі і якой карысталіся нашы далёкія продкі. Змяняюць адзін другога шматлікія пласты зямлі— гэта перад табой праходзяць перыяды жыцця нашага горада...

Калі навуковы супрацоўнік АН БССР Э. М. Загарульскі прапанаваў арганізаваць археалагічны гурток, яго падтрымалі многія студэнты. Цяпер гурток працягвае сваю работу. Кожны студэнт працуе над той ці іншай праблемай. Гуртkоўцы рыхтуюць да выпуску кароткаметражны фільм «У зямлі радзімічаў», зроблены па матэрыялах экспедыцыі.

Кожнаму з гуртkоўцаў хочацца ўнесці свой уклад у вывучэнне праблемы станаўлення славянства. І хоць гурток існуе ўсяго першы год, ён ужо можа ўдзельнічаць ва ўсесаюзных студэнцкіх археалагічных з'ездах.

Р. ХАРАШАВІНА,
В. ГІЛЕП.

АГЛЯД ДРУКУ

## Газеты студэнцкіх навуковых таварыстваў

Шырокі светлы калідор біялагічнага корпуса. На стэндах вісяць аб'явы, расклады, геаграфічныя карты, насценныя газеты. Адразу ж заўважаеш газету студэнцкага навуковага таварыства геаграфічнага факультэта «Исследователь». Прыгожа афармлены загалоўкі, цікавыя фатаграфіі. Знешні выгляд газеты гаворыць, што рэдкалегія надае афармленню «Исследователя» важнае значэнне.

Яшчэ больш задаволеным застаешся, калі прачытаеш матэрыялы, апублікаваныя ў нумары. Студэнткі чацвёртага курса Г. Кавальчук і Г. Грудовік расказваюць, як прайшла іх вытворчая практыка, якія даследаванні яны зрабілі. З насценнай газеты можна даведацца аб навінках геаграфічнай літаратуры, а аддзел «Геаграфічны летапіс» знаёміць з датамі жыцця буйнейшых рускіх вучоных і даследчыкаў.

Спадабаліся нам «Бюлетэні СНТ» біялагічнага і хімічнага факультэтаў. У іх змешчаны агляды найбольш цікавых дыпломных работ, навуковых прац выкладчыкаў і студэнтаў.

Чытаючы адзін бюлетэнь за другім, уяўляеш сабе, чым заняты навуковыя работнікі і студэнты, над чым яны працуюць.

Але насценныя газеты СНТ чамусьці не асвятляюць дзейнасці студэнцкіх навуковых гурткоў. Толькі ў «Бюлетэні СНТ» геаграфічнага факультэта змешчана заметка старшыні савета СНТ В Калечыца, у якой пералічваюцца назвы гурткоў і тыя меры, якія вырашана прыняць для паляпшэння іх работы. Астатнія ж газеты ніводным словам не успамінаюць аб дзейнасці навуковых гурткоў.

Цікавую газету студэнцкага навуковага таварыства мы спадзяваліся ўбачыць на філалагічным факультэце. Там жа вучацца будучыя журналісты, літаратура- і мовазнаўцы. Але замест «Бюлетэня СНТ» мы ўбачылі стэнд з разбітым шклом і пажоўклую, двухгадовай даўнасці, адну старонку газеты. Не ўбачылі мы «Бюлетэняў СНТ» на юрыдычным, матэматычным, фізічным і гістарычным факультэтах. А шкада!

М. ЯКІМЧЫК.



Для аспірантკі кафедры заалогіі беспазваночных Л. Камлюк работа ў студэнцкім навуковым гуртку была адным з першых крокаў у навуку.

Фота Э. ДАМАРАЦКАГА.

## Вывучэнне праблем парэформеннай Расіі

*Савецкая гісторыяграфія справядліва падкрэслівае грабіцельскі характар рэформы 1861 года. Але пры канкрэтнай характарыстыцы ступені аграблення сялян, гэта значыць, колькі было адрэзана зямлі ў сялянства, гісторыкі да гэтага часу карыстаюцца дарэвалюцыйнай статыстыкай, нізкая якасць якой добра вядома.*

*Глыбокае вывучэнне рэалізацыі рэформы выклікала неабходнасць звярнуцца да асноўных дакументаў — устаўных грамат і выкупных актаў, якія адлюстроўваюць сапраўдныя ўмовы выхада сялян з-пад крапасной залежнасці. У сучасны момант вывучана больш 22 працэнтаў агульнай колькасці грамат.*

*Работу ўзначальвае Камісія па гісторыі сельскай гаспадаркі і сялянства пры Інстытуце гісторыі АН БССР. Па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам доктара гістарычных навук В. К. Яцунскага распрацавана адзіная методыка — састаўлена картка, на якую заносяцца асноўныя паказчыкі з кожнай устаўной граматы і кожнага выкупнога акта.*

*У Беларусі суцэльнае вывучэнне устаўных грамат і выкупных актаў упершыню прадпрынята ва універсітэце. Пры кафедры гісторыі СССР працуе студэнцкі навуковы гурток, які вядзе навукова-даследчую работу ў Дзяржаўным архіве Мінскай вобласці.*

*У сучасны момант вывучаны звесткі 600 інвентароў, 560 устаўных грамат і 410 выкупных актаў. Пакуль што вывучаюцца матэрыялы толькі Мінскай вобласці.*

*У далейшым нам прадстаіць вывучыць яшчэ больш двух тысяч дакументаў, тысяча з якіх знаходзіцца ў фондзе Галоўнага выкупнога прадпрыемства ў Ленінградзе. Гэта патрабуе паездкі 10 чалавек у Ленінград.*

*Пасля занясення звестак аб усіх пасяленнях Мінскай вобласці на карткі будзе завершан першы этап работы. Затым пачнецца другі — больш творчы, калі студэнты прыступяць да апрацоўкі сабраных статыстычных матэрыялаў.*

*Добрасумленна і ўважліва адносіцца да работы студэнтаў і забяспечвае бесперабойную работу нашага калектыва ў архіве начальнік дарэвалюцыйнага фонда Т. Е. Лявонцьева, супрацоўнікі Н. К. Булыга, О. П. Ліхачова.*

*У будучым мы мяркуем працягваць работу разам з супрацоўнікамі інстытута гісторыі АН БССР з тым, каб у бліжэйшыя два гады правесці суцэльнае вывучэнне грамат, выкупных актаў і інвентароў усіх беларускіх губерній. Мы ўпэўнены, што студэнты гістарычнага факультэта прымуць у гэтай рабоце самы актыўны ўдзел.*

М. ФРЫДМАН,
дацэнт.

*Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, пакой 212, тэл. 2-07-19. Друкарня Выдавецтва МВСС і ПА БССР.* АТ 08972. Зак. 523. Т. 2000. **Нам. рэдактара А. ВОЛК.**